**Дата правядзення:** 18.02.2020

**Удзельнікі:** вучні 8 класа

**Адказны:** Казак А.М.

**Тэма:** Сям'я, як многа ў гэтым слове!

**Форма правядзення:** інтэрактыўная гутарка

**Мэта:** выхаванне культуры сямейных адносін.

**Задачы:** - фарміраваць уяўленні аб жыццёвым ідэале сям’і;

- фарміраваць павагу да членаў сям’і;
- фарміраваць навыкі сямейнай дыпламатыі;
- фарміраваць уменне аналізаваць сітуацыю;
- вучыць выпрацоўваць уласную тактыку прыняцця рашэнняў.

**Ход класнай гадзіны**

Добры дзень, рабяты! Сягодня мы з вамі пагаворым аб сям’і, аб сямейных традыцыях. Калі вам кепска рабяты, калі цяжка, калі вас пакрыўдзілі, хто вас пашкадуе, прыгалубіць, пайме і суцешыць? Канешне вашы мамы, бабулі, таты, родныя і блізкія вам людзі – сям’я. Сям'я з'яўляецца для чалавека самым важным у жыцці.

Слова “бацькоўская хата”, “сям’я” уваходзяць у нашу свядомасць з першых дзён жыцця. Адкажыце, калі ласка, на пытанне: “Што такое сям’я?” Што ўзнікае ў вашай свядомасці, калі вы гаворыце гэтае слова?(адказы дзяцей, састаўленне кластэра на дошцы).

У сям’і ідзе ўсё сваёй чарадой: нараджаюцца дзеці, якія пасталеўшы, самі становяцца спачатку бацькамі, а потым: дзядулямі, бабулямі, прадядулямі і прабабулямі. Калі яны былі маленькімі, то пра іх клапаціліся іх бацькі, а калі яны самі сталі бацькамі, то сталі клапаціцца аб сваіх дзецях і аб сваіх пажылых бацьках. І так паўтараецца з пакалення ў пакаленне на працягу ўсёй гісторыі чалавецтва.

Расшыфруйце і запомніце галоўны абавязак сям’і:

*І’мяс іманелч імыратс і імыровх аз дялгод і йецязд еннавахыв.*

*(Выхаванне дзяцей і догляд за хворымі і старымі членамі сям’і).*

Як вы думаеце, чаму слова сям’я складаецца з 7 Я? (адказы дзяцей)

Як з’явілася слова “сям’я”?

Калісьці аб ім не чула зямля,

Але Еве сказаў перад вяселлем Адам,

Зараз я табе сем пытанняў задам:

Хто дзетак народзіць, багіня мая?

І Ева ціхенька адказала: “Я”.

Хто сукенку пашые, будзе праць бяллё,

Мяне прыгалубіць, упрыгожыць жыллё?

Адкажы на пытанні, сяброўка мая,

“Я, я, я” – Ева адказала – “Я”,

Сказала яна знакамітых сем “Я”

І так на зямлі з’явілася “сям’я”.

Рабяты, а як вы думаеце, усе сем’і аднолькавыя? (адказы дзяцей)

Так, розныя. А чым яны адрозніваюцца? (адказы дзяцей: звычкамі, укладам, традыцыямі, атмасферай, традыцыямі і г.д.)

Зараз мы вызначым, якія бываюць сем’і. Калі ласка, прыдумайце прыметнікі да слова сям’я, якія пачынаюцца на літары С, Я, М, Я. ( дзеці насупраць літар падбіраюць словы)

У кожнага з вас ёсць жаданне жыць у шчаслівай сям’і. А якая сям’я лічыцца шчаслівай? Прадстаўце сваю пазіцыю. (узаемная павага, каханне, вернасць, цярпімасць, справядлівасць, матэрыяльны дастатак, павага да захапленняў членаў сям’і, наяўнасць дзяцей і г.д.)

Што яшчэ больш можа з’яднаць сям’ю? ( адказы дзяцей)

Так, сумесная справа. І я прапаную пагуляць у гульню “ Узаемаразуменне”

Работа ў парах.

(На кожную парту падрыхтавана галаваломка, якую неабходна скласці. Хто першы правільна складзе яе, тая пара і перамагае. Малюнак разрэзаны на маленькія кавалачкі, неабходна яго скласці)

Сваяцкія пачуцці становяцца для нас школай асабістых душэўных уласцівасцей. На іх мы раней усяго вучымся каханню і дружбе, падпарадкаванню і кіраўніцтву, вучымся быць мужчынам і жанчынай. Атрымліваецца, што сям’я – гэта наша першае і самае натуральнае

грамадства. А знаходзячыся ў грамадстве, нельга быць ад яго свабодным, патрэбна быць яму чымсьці абавязаным, павінным.

**Работа ў групах.**

Вам неабходна размеркаваць сярод членаў сям'і наступныя абавязкі: мыць посуд, мыць падлогу, мыць абутак, выціраць пыл, гатаваць сняданне, гатаваць абед, гатаваць вячэру, гатаваць у выхадныя дні, даглядаць за хатнімі жывёламі, пылесосіць у хаце, паліваць пакаёвыя расліны, займацца з малочшымі дзецьмі, выносіць смецце, хадзіць у краму, прыбіць што-небудзь, рамантаваць адзенне. (абмяркаванне вынікаў)

Стварыць сям'ю нялёгка, а захаваць яе яшчэ цяжэй. Усё бывае ў сям'і: беды і радасці, але дастойна рашыць канфлікты ўдаецца далёка не ўсім.

Ці патрэбна рашаць канфлікты?

Якой стратэгіі прытрымлівацца ў дадзенай сітуацыі?

**Работа ў групах**. Абмеркаванне сітуацый.

Сітуацыя №1. Дачка (сын) вельмі дрэнна вучацца. Маму вызвалі ў школу. Пасля наведвання адбылася размова з дачкой (сынам).

Сітуацыя №2. Дачка (сын) патрабуе ад бацькоў купіць модную рэч. Бацькі тлумачаць, што зрабіць гэта зараз не могуць.

*(Задача для дзяцей: вызначыць, якія пачуцці адчуваюць бацькі і дзеці у дадених сітуацыях, знайсці прычыну канфлікта, вызначыць правільную тактыку паводзін для выхаду з канфліктнай сітуацыі, прапанаваць рашэнне, вызначыць, якія меры можна будзе прадпрыняць для папярэджвання канфлікта. Кожная група прапаноўвае свой варыянт адказа)*

У самай складанай сітуацыі заўсёды ёсць выхад, любую праблему можна рашыць яшчэ тады, калі яна не пераўтварылася ў канфлікт. Неабходна толькі ўстаць на пазіцыі бацькоў, паняць іх, прыслухацца да іх аргументаў.

Я раскажу вам адну легенду аб сям'і. У даўнія часы жыла вялікая і дружная сям'я са 100 чалавек, і ў ёй заўсёды панавалі мір, каханне і згода. Звесткі аб ёй даляцелі да правіцеля краіны. Ён вызваў да сябе главу сям'і і спытаў у яго: "Як у вас атрымліваецца жыць, ніколі не сварачыся, не крыўдзячы адзін аднаго?" Той узяў бумагу і напісаў на ёй нешта. Адказ здзівіў правіцеля: на лісце было напісана 100 раз слова "паразуменне"!

А зараз я прапаную вам пабудаваць такі дом, дзе будзе ўтульна, дзе зразумеюць, паспачуваюць і падтрымаюць.

**Работа ў групах.**

У кожнай групы ёсць “будаўнічы матэрыял” (малюнкі – “кірпічыкі”, крыша дома, акно)

1 група

**Заданне:** падрыхтаваць “фундамент” – запісаць галоўны абавязак сям’і.

2 група

**Заданне:** стварыць “Тэхніку бяспекі” у канфліктных сітуацыях (запісаць на кірпічыках што можна, што нельга)

3 група

**Заданне:** падабраць малюнкі, колерам і ілюстрацыямі выказваючыя тыя пачуцці і эмоцыі, якія вы жадаеце бачыць у сваім доме.

А зараз, калі наш “будаўнічы матэрыял” гатовы, пабудуем ДОМ

*(Дзеці з кожнай групы абгрунтоўваюць свае дзеянні)*

Паглядзіце, які цудоўны дом у нас атрымаўся! Жыць у сям’і – гэта вялікая творчасць. І мне хочацца ўзгадаць словы У.А.Сухамлінскага “У сямейным жыцці патрэбна лічыцца з думкамі, меркаваннямі, пачуццямі, імкненнямі каханага чалавека. Захоўваючы сваю годнасць, неабходна умець уступаць адзін аднаму”.

А закончу нашу класную гадзіну я вось такой казкай.

Аднойчы Дабро прыйшло ў госці да Зла. Зло стала частаваць Дабро гарбатай, але ў кубак замест цукру паклала соль. Дабро паспрабавала салёную гарбату і сказала: “Нешта цукар у Вас не вельмі салодкі. Вось Вам грошы, купіце сабе цукерак да гарбаты”. Зло скрывілася, але рабіць няма чаго, прыйшлося ўзяць грошы. Так Дабро адплаціла Злу дабром”.

Сапраўды, лепш заўсёды плаціць дабром, пакідаючы пасля сябе толькі харошыя, сардэчныя ўспаміны.

Сягодня мы размаўлялі з вамі пра сям’ю. Гэта вечная тэма, да якой можна вяртацца не раз і знаходзіць новыя аспекты для размовы. Я дзякую вам за ўдзел, за вашу актыўнасць і хачу сказаць: “Гавораць, што чалавек без падтрымкі адчувае сябе слабым. Няхай ваша сям’я і ваш дом будуць для вас заўсёды вашай апорай”

## Крыніцы інфармацыі


1. Дереклеева, Н.А.Справочник классного руководителя / Н.А. Дереклеева. – ВАКО, 2008. – 304 с.
2. Сухомлинский, В. А. Мудрость родительской любви / В. А. Сухомлинский.– М., 1988. – 303 с.
3. Шалаева, Г. П. Новые правила поведения для воспитанных детей / Г. П. Шалаева, О. М. Журавлева. – М., 2011. – 158 с.

**Дадатак 1**

## Фотасправаздача па правядзенні класнай гадзіны






